Падтрымай "Вясну" на PATREON

Да трох гадоў "хіміі" асудзілі палітвязня за ўдзел у акцыі пратэсту ў дзень выбараў

30.11.2021 **Тэгі**: суды, крымінальны пераслед, палітвязні

У судзе Савецкага раёна 30 лістапада вынесены прысуд палітзняволенаму 30-гадоваму мінчуку Дзянісу Ляхару, якога абвінавацілі ў актыўным ўдзеле ў групавых дзеяннях, якія груба парушаюць грамадскі парадак (ч. 1 арт. 342 КК). Дзяніса затрымалі роўна праз год пасля выбарчай акцыі пратэсту, у якой ён прыняў удзел, і змясцілі пад варту. Сёння палітвязень быў вызвалены ў зале суда. Суддзя Марына Фёдарава асудзіла яго да трох гадоў "хіміі". Дзяржабвінавачванне па справе падтрымліваў памочнік пракурора Маліко.



Палітвязень Дзяніс Ляхар у першыя хвіліны на волі. Фота: spring96.org

Згодна версіі абвінавачвання, Дзяніс Ляхар 9 жніўня 2020 году *"прыняў актыўны ўдзел у групавых дзеяннях, якія груба парушылі грамадскі парадак, выказваў яўнае непадпарадкаванне законным прадстаўнікам уладу, перашкаджаў руху грамадскага транспарту, выкрыкваў лозунгі і станавіўся разам*

з іншымі нявысветленымі асобамі ў счэпку".

Дзяніс прызнаў віну цалкам.

Падчас судовага пасяджэння 29 лістапада Дзяніс Ляхар патлумачыў, што вечарам 9 жніўня 2020 года, разам з сябрам Андрушкевічам з-за цікаўнасці апынуліся ў горадзе, прайсціся па праспекце.

У раёне Стэлы да іх падышоў незнаёмы чалавек, у якога былі бэйдж і прафесійная камера і папрасіў стаць у счэпку на некалькі хвілін, каб зрабіць фотаздымкі. Калі такім чынам невядомы "папрацаваў", сябры разыйшліся і болей у акцыях пратэсту не ўдзельнічалі.

Прадстаўнік "Мінсктранса" вылучыў матэрыяльную прэтэнзію за прастой грамадскага транспарту ў гэты вечар, якую прадпрыемства ацаніла ў 3 621 рубель 21 капейку.

Дзяржабвінавачанне запрасіла для Ляхара прызначыць пакаранне ў выглядзе абмежавання волі тэрмінам на тры гады з накіраваннем ва ўстанову адкрытага тыпу. Такое пакаранне і прызначыла суддзя Марына Фёдарава. Матэрыяльны пазоў "Мінсктранса" пастанавілі вярнуць на разгляд для ўдакладнення сумы разліку.

Твитнуть









Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску

"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных

WWW.GAZETABY.CO

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур’ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"



ГАЛОЎНАЕ







АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"

Затрыманні і арышты: хроніка палітычнага пераследу 24-26 красавіка (дапоўнена)

Мужчыну асудзілі за ўдзел у Маршы і бойку з прычыны "палітычнай абстаноўкі" у 2020 годзе

У Мінску судзяць стрыечнага брата намесніка камандзіра палка Каліноўскага Вадзіма Кабанчука: пракурор просіць тры гады калоніі

"У думках з тымі, хто сустракае гэты дзень за кратамі". Міжнародная супольнасць віншуе “Вясну” з днём народзінаў

Мужчыну асудзілі на год "хіміі" за сарваны сцяг

"Мы не хочам быць заложнікамі", – вясноўцы на акцыі ў Вільні

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

"Суды страцілі сваю функцыю, а грамадзянская супольнасць перанесла ачышчальную атаку". Павел

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць







ПАРТНЁРСТВА

СЯБРОЎСТВА

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY